ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сакратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

ГОД ВЫДАНЬНЯ IX.

Кошт асобнага №—2 кап.

№ 104 (1071) | АЎТОРАК, 6-га мая 1930 г.

11-га МАЯ 5-ты ПЛЕНУМ ЦК ЛКСМБ

Усім членам і кандыдатам ЦК і цэнтральнай рэвізійнай камісіі ЛКСМБ

11 мая г. г. склікаецца 5-ты пленум ЦК ЛКСМБ з наступным парадкам дню:

1) Даклад бюро ЦК ЛКСМБ аб выкананьні дырэктыў пленуму ЦК КП(б)Б і ЦК УсеЛКСМ (Дакл. тав. Палякоў).

2) Даклад аб падрыхтоўцы кадраў і задачах ЛКСМБ (Дакл. т. т. старшыня Дзяржпляну Гольдбэрг і Шоламаў),

3) Аб вайскова-фізкультурнай рабоце (Дакл. т. т. Ільлічаў і Лоў).

4) Аб перавыбарах бюро ячэек і комітэтаў ЛКСМБ (Дакл. тав. Рындзіч).

Сакратар ЦК ЛКСМБ ПАЛЯКОЎ.

МАГІЛЬШЧЫК КАПІТАЛІЗМУ — РЭВОЛЮЦЫЙНЫ ПРОЛЕТАРЫЯТ

1-га МАЯ ПРАВЯРАУ СВАЮ БАЯЗДОЛЬНАСЬЦЬ

Крывавыя рэпрэсіі буржуазіі, пры дапамозе яе наймітаў, ня здолелі прыпыніць выступленьняў шматмільённых сталёвых пролетарскіх батальёнаў

Вулічныя выступленьні былі забаронены

ВЕНА, 4. Згодна прапановы соцыял-дэмократычнай фракцыі парламанту, румынскі ўрад загадаў спыніць 1-га мая працу ў дзяржаўных установах. Вулічныя выступленьні былі забаронены. У Бухарэсьце паліцыя бязьлітасна разганяла ўсіх рабочых, якія спрабавалі зьбірацца на вуліцах. Падрабязнасьцяй аб дні 1-га мая яшчэ няма. Вядома толькі, што напярэдадні ўчынены масавыя арышты ў буйных гарадох.

Нават буржуазная прэса вымушана прызнаць посьпех комуністычных дэмонстрацый

БЭРЛІН, 3. Уся буржуазная прэса вымушана прызнаць выключны посьпех першамайскіх дэмонстрацый, арганізаваных комуністычный партыяй. „Кельнішэ Цэйтунг“ і „Нацыяналь Соцыяліст“ констатуюць, што комуністычная дэмонстрацыя лікам у тры разы перавышала соцыял-дэмократычную.

Узмацненьне сялянскага руху на Філіпінскіх выспах

ШАНХАЙ. На Філіпінскіх выспах, у сувязі з экономічнай дэпрэсіяй у сельска-гаспадарчых раёнах, узмацніўся сялянскі рух супроць зямляўласьнікаў і мясцовай арыстакратыі. У провінцыі Луван 30 тысяч сялян—дробных арандатараў абвясьцілі байкот 7 буйным зямляўласьнікам. На сялянскіх сходах прымаюцца рашэньні ня весьці з імі ніякіх спраў, нічога ня купляць, нават не гаварыць з імі і не наведваць цэркваў.

Забастоўка гарнякоў і мэталістых у першамайскія дні

ПАРЫЖ, 4. Арыштаваныя за продаж першамайскага нумару „Юманітэ“ жорстка зьбіты паліцыяй. З 160 арыштаваных замежных рабочых 70 высланы з Францыі. Па вестках „Юманітэ“ 1-га мая ў вугольным басэйне Луары баставала 25 тысяч гарнякоў і 35 тысяч мэталістых — рэкордная лічба за апошнія 10 год. На калійных капальнях Страсбургу дэманстравала 5000 гарнякоў. Там адбыліся сутычкі з паліцыяй. Рабочыя адбілі захопленыя паліцыяй чырвоныя сьцягі.

Першамайскія дэмонстрацыі ў Нямеччыне



На здымку: агульны від дэмонстрацыі з лёзунгамі: „Абараняйце Савецкі Саюз“, „Няхай жыве Савецкая Нямеччына“, „Прэч лапы Юнга“, „Няхай жыве 7-гадзінны працоўны дзень“ і г. д.

Дэмонстрацыі моладзі і піонэраў

ПРАГА, 2.—Па ўсёй Чэха-Славакіі адзначаецца масавы ўдзел у дэмонстрацыях моладзі і піонэраў. Найбольш шматлюдныя дэмонстрацыі адбыліся ў Астраве, дзе ў іх прымала ўдзел каля 10 тысяч чалавек. Пры разгоне мітынгу было ранена некалькі рабочых. Каля 20 рабочых арыштавана. У Кладно 1-га мая дэмонстравала некалькі тысяч гарнякоў. На дэмонстрантаў накінуліся моцныя атрады паліцыі, якая засела ў дварох дамоў тых вуліц, па якіх праходзілі дэмонстрацыі. Сутычкі між рабочымі і паліцыяй працягваліся каля гадзіны. Бурна дэмонстравалі некалькі тысяч. Пасьля мітынгу дэмонстранты накіраваліся да памяшканьня турмы, патрабаваўшы вызваленьня палітзьняволеных. У схватцы з паліцыяй нёкалькі паліцэйскіх ранены. Арыштавана 16 рабочых. Некалькі паліцэйскіх ранена таксама на шматлюдным мітынгу ў Братыславе. Шматлюдныя мітынгі-дэмонстрацыі адбыліся ў Нэстэ, у якіх прынялі ўдзел 5 тысяч гарнякоў, у Фрыдзіку—2 тысячы ўдзельнікаў, у Аўсігу—1500 удзельнікаў і г. д.

Савецкая ўлада ў правінцы Гуансі

ШАНХАЙ, 4-V. Ангельская газэта «Дэйлі Прэс», якая выдаецца ў Гонконгу, паведамляе, што ў правінцыі Гуансі комуністыя займаюць зараз больш за 20 раёнаў. Савецкі ўрад раёну складаецца з 11 прадстаўнікоў рабочых, сялян, салдат і студэнтаў. Шанхайскі падпольны друк зазначае, што з 78 паветаў Чжэцзяну 38 ахоплена сялянскім рухам.

ШАНХАЙ, 4-V. Ангельскія газэты, якія выдаюцца ў Кітаі, выказваюць вялікую трывогу ў сувязі з ростам арганізацыйнага комуністычнага руху і бясьсільля нанкінскага ўраду.

Апублікаваньне фальшывых антысавецкіх дакумантаў

НЬЮ-ЁРК, 3.— Начальнік Нью-Ёркскай паліцыі Уолен перадаў для апублікаваньня ў друк здымкі лістоў-фальшывак, якія павінны паказаць, што Амгандаль, ОДПУ і Савецкі ўрад, у прыватнасьці Сквірскі (заг. савецкага інформбюро ў Вашынгтоне) непасрэдна адказны за дзейнасьць комуністых у Злучаных Штатах.

Зьмест аднэй фальшыўкі зводзіцца да наступнага: ліст паведамляе нейкага Грапэна, што выканкомы Комінтэрну і Профінтэрну загадваюць яму зноў накіравацца ў Злучаныя Штаты ў якасьці генэральнага прадстаўніка гэтых арганізацый з тым, каб утварыць штаб у Сіэтлі і пачаць нелегальную працу. Старшыня Амгандлю Багданаў зьвярнуўся к Уолену з лістом, у якім катэгорычна заяўляе, што апублікаваныя ў друку дакуманты зьяўляюцца абсолютнай падробкай і просіць дакладна расьсьледваць справу. Па паведамленьню з Вашынгтону загадчык савецкага інформбюро Сквірскі ў гутарцы з прадстаўнікамі друку ўказаў, што апублікаваныя дакуманты зьяўляюцца яўнай падробкай і выказаў надзею, што ўрад утворыць пільнае расьследваньне.

ЦК компартыі ПАЗШ апублікаваў заяву, у якой гаворыць, што дакуманты ўяўляюць сабою бязглуздыя злачынныя фальшыўкі. Бессаромнай хлусьнёй зьяўляецца сьцьвярджэньне аб атрыманьні компартыяй або комуністычным друкам субсыдыі ў якой-небудзь форме або з якой-небудзь крыніцы, паказанай у дакумантах. Далей у заяве ЦК паказваецца, што фабрыканты фальшывак нарабілі памылак у загалоўках на бланках лістоў, паколькі „амэрыканскай сэкцыі выканкому Комінтэрну“ ня існуе. Акрамя таго, Комінтэрн і Профінтэрн ніколі не выдаюць сумесна мандатаў.

АПУБЛІКАВАНЬНЕ ДАКУМАНТАЎ УЯЎЛЯЕ САБОЮ ЧАСТКУ АНТЫСАВЕЦКАЙ КАМПАНІІ.

Дзяржаўны дэпартамант (міністр замежных спраў) апублікаваў наступную заяву: дэпартамант ня меў вестак аб тым, каб Амгандаль удзельнічаў у якой-небудзь прапагандысцкай дзейнасьці ў Злучаных Штатах. Міністэрства юстыцыі апублікавала аналёгічную заяву. „Нью-Ёрк Таймс“ піша: „Апублікаваныя дакуманты напамінаюць ліст Зіноўева. У той час, як большасьць газэт апублікавала гісторыю з фальшыўкамі, падрабязна прылажыўшы зьместы дакумантаў, „Джорнальоф Коммэрс“ прысьвяціў усёй гісторыі 23 радкі на задворках, прычым у гэтых 23 радкох больш усяго места аддала абвяржэньню Багданава.

Вечар юбілею „Чырвонай Зьмены“*)

Заля Дому Селяніна напоўнена моладзьдзю. Месцы, праходы і другі паверх заняты юнкорамі, чытачамі „Чырвонай Зьмены“.

На юбілейны вечар газэты „Чырвоная Зьмена“ зьявілася больш 800 чалавек.

Комсамольскія песьні, шум і бадзёрасьць. У залі адчуваецца асаблівы ўздым.

Памяшканьні ўбраны плякатамі і сьцягамі. Багатая выстаўка друку.

Урачыстае паседжаньне адчыняе сакратар Менскага АК ЛКСМБ тав. Гайдукевіч.

Даклад рэдакцыі комсамольцы, юнкоры і чытачы слухаюць уважліва.

Прывітаньні юбіляру.

Бурнымі авацыямі сустракаецца выступленьне маладога камсамольца з Лейпцыгу (Нямеччына) саюзу чырвоных франтавікоў, які прыехаў на першамайскія ўрачыстасьці ў Менск.

У сваім прывітаньні юбіляру ён кажа:

— Маладым бальшавіком, комсамольцам Менску і газэце „Чырвоная Зьмена“ ад камсамолу Лейпцыгу і саюз Чырвоных франтавікоў Нямеччыны шчырае рэволюцыйнае прывітаньне.

Гэтыя словы пакрыліся шумнымі магутнымі авацыямі залі.

— 9-гадовы юбілей вашай газэты „Чырвоная Зьмена“—працягвае ён—цесна ўвязаў нашу працу з вашай. Ваш друк і наш комуністычны друк змагаюцца за адзіныя мэты. Маладыя пролетары Нямеччыны змагаюцца за стварэньне свайго магутнага пролетарскага друку, даючы рашучы адпор соцыял-фашысцкім пісакам.

Нямецкая буржуазія разам з соцыял-фашыстамі арганізоўваюць наступ на пролетарыят, але рэволюцыйны пролетарыят згуртоўваючы ўсё больш і больш свае сілы, дае належны адпор міжнароднай буржуазіі і яе прысьпешнікам.

Будзем спадзявацца, што наступны першы май будзем сьвяткаваць мы ў Чырвонай савецкай Нямеччыне—з захапленьнем і поўны упэўненасьці скончыў ён.



Тав. Любан.

Выступаючы прадстаўнік ад рабочай дэлегацыі Украіны—комсамолец Ільліцкі—гаворыць:

— „Дозвольте товариші використати цеи вечір, щоб передати палке вітанне ленінському комсомолу Білорусі, ЦК ЛКСМ, Менському округовому комітету та их органу „Чырвоної Зміні“.

— Товариші, Ваша газета відограла велику ролю в организації масс робітничої молоді навкола завдань нашої партиі. Ми упевнени в тім, що газета й на далі буде организатаром молодзі навколо генаралької лінні партиі за перемогу соціялізму в нашої краіні“.

Вітаючы газэту „Чырвоная Зьмена“ прадстаўнік Радыё-цэнтру і радыё-газэты „Чырвонай Зьмены“ тав. Наўмёнак адзначыў аб вялізарнай рабоце, якую робіць газэта „Чырвоная Зьмена“ у справе згуртаваньня моладзі навакол важнейшых задач партыі па будаўніцтву соцыялізму.

Пасьля ўрачыстай часткі—вялікі концэрт.

Сымфонічным оркестрам радыёцэнтру, беларускай і яўрэйскай дзяржаўнымі копэлямі сьпевакамі выканана шэраг надзвычайна каштоўных рэчаў.

Кіраўнік концэрту—дырыжэр аркестру, вылучэнец комсамолец—юнкор тав. Любан падабраў надзвычайна вялікую і высокай якасьці програму концэрту. Усе нумары концэрту падаваны выканаўцамі надзвычайна добра, жыва і бадзёра. Музычна-мастацкія вобразы, вясёлыя жывыя сьпевы бадзёрылі залю.

Вечар юбілею прайшоў з надзвычайным уздымам, вялікаю масавасьцю.

Я. Красуцкі

*) Даклад тав. Джэлюка аб рабоце газэты будзе зьмешчан у наступным нумары „Ч. З.“.

Лісток „Лёгкай кавалерыі"

КОМСАМОЛЬСКАЯ „КОНЬНІЦА"—У НОГУ З ЖЫЦЬЦЁМ!

ШМАТ ЯКІЯ АТРАДЫ „ЛЁГКАЙ КАВАЛЕРЫІ" ПАСЬЛЯ ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЛЁТУ СЬПЯЦЬ ЛЁТАРГІЧНЫМ СНОМ

Рашэньні зьлёту ў большасьці атрадаў „ЛК" не праводзяцца ў жыцьцё

Неадкладна праверыць выкананьне рашэньняў зьлёту, замацаваўшы іх практычнай работай

„Комунараўцы" за работай

Для лепшай праверкі выкананьня прамфінпляну, штабам „Лёгкай Кавалерыі" пры заводзе „Комунар" былі выдзелены брыгады, па 3 „кавалерыстыя" у кожнай. Брыгады актыўна ўдзельнічалі ў працы вытворчых камісій цэхаў. Яны вывучалі як выконваецца прамфінплян, а таксама праводзілі праверку работы вытворчых камісій наогул. Правераны камісіі: бляшанага, сьлясарнага, такарнага і кавальнага цэхаў. Акрамя таго, штабам „Лёгкай Кавалерыі" кожны месяц праводзіцца праверка выкананьня прамфінпляну, высьвятляюцца прарывы і іх прычыны, пасьля гэтага ўвесь матар'ял перадаецца ў завком для зьнішчэньня выяўленых недахопаў. У выніку гэтых мерапрыемстваў прамфінплян выканан з перавышкай.

Па ініцыятыве „Лёгкай Кавалерыі" зроблена павець для гатовых фабрыкатаў, якія да гэтага часу ляжалі пад адкрытым небам і псаваліся.

Каб падняць працоўную дысцыпліну „Лёгкай Кавалерыі" была складзена ініцыятыўная група па барацьбе з прагуламі і сымуляцыяй.

«Лёгкая Кавалерыя» таксама выкрыла факты няправільнай выдачы заработку рабочым.

Атрад „Лёгкай Кавалерыі" зрабіў налёт на заводзкую кантору і выявіў факты спазьненьня на заняткі супрацоўнікаў канторы, а ў дырэктара заводу знайшоў масу заяў рабочых, на якія ён не адказваў. Матар'ял налёту скарыстаны ў заводзкай газэце.

Атрадам была праведзена праверка работы коопэрацыйнай камісіі. Выяўлена **няправільная задача** і разьмеркаваньне талёнаў. Атрад „Лёгкай Кавалерыі" таксама працаваў і па-за сьценамі заводу. Шмат недахопаў па настаяньню „Лёгкіх Кавалерыстых" былі зьнішчаны.

В. Я.

„Міма важнейшых задач"

Ня так даўно адбыўся зьлёт „Лёгкай кавалерыі" Нова-Беліцкага раёну (Гомельшчына), дзе яскрава ўскрыліся ўсе недахопы ў працы „Л.К.".

Абраны раённы штаб ніякай падрыхтоўчай працы да зьлёту ня вёў і ў выніку **зьлёт быў амаль-што сарваны.** *За гэта РК комсамолу усяму складу штабу „Лёг. Кав." вынес вымову. Гэтым і скончылася. Новаабраны раённы штаб з 9 асоб таксама не працуе. Групы на мясцох не адчуваюць ніякага кіраўніцтва. Члены штабу на свае паседжаньні ня прыходзяць і яны зрываюцца.*

Старшыня штабу **Клябанаў** *зусім ня цікавіцца працай „Л. К.". Для яго гэта лішняя „нагрузка".*

РК комсамолу таксама ня кіруе „Лёгкай Кавалерыяй".

У Нова-Беліцы маецца шмат нездаровых зьявішчаў, на якія трэ' было-б рэагаваць, але „Лёгкая Кавалерыя" нічога ня робіць. На ф-цы «Вэзуві» ня выканан прамфінплян, ёсьць шмат браку. Лесазавод „Соцыялізм" мае шмат простояў, астановак. У колектыве ЦРК таксама шмат недахопаў, але «Лёгкая Кавалерыя» праходзіць міма і не стараецца іх зьнішчыць.

РК комсамолу неабходна зараз-жа ўзяцца за палепшаньне кіраўніцтва „Лёгкай Кавалерыяй".

Манькевіч Віктар.



Спатыкнуўся на цяжкім шляху

Бяз руля і без ветрыл

Раённы зьлёт „Лёгкай Кавалерыі" гор. Барысава, які адбыўся ў студзені месяцы бягучага году, выявіў шэраг хваробных зьяў у працы „Лёгкай Кавалерыі". РК ЛКСМБ і ячэйкі ня кіруюць ёю. Рабочыя ня ведаюць аб іспаваньні атрадаў „Лёгкай Кавалерыі", бо гэта ня масавыя, а маленькія групкі, як, напрыклад, „Лёгкая Кавалерыя" ф-кі «Чырвоная Бярэзіна», якая налічвае толькі 10 чалавек, тады як на ф-цы аднэй толькі моладзі больш 300 чалавек.

І вось для таго, каб зьнішчыць гэтыя недахопы, каб паставіць на належную вышыню працу „ЛК" і быў абран раённы штаб „Лёгкай Кавалерыі". Здавалася-б, што абраны райштаб і павінен кіраваць, але ў нас выходзіць зусім наадварот—абраны штаб фактычна ня існуе і, вядомая рэч, калі «кавалерыяй» ня кіруе ні комсамол, ні раённы штаб, дык і працы няма.

У Барысаве „Лёгкая Кавалерыя" ня стала яшчэ масавым пролетарскім кантролем. Так ёсьць асобныя маленькія групкі „ЛК" аб якіх мала ведае рабочая маса.

Задача РК комсамолу заключаецца ў тым, каб зрабіць «ЛК» масавым атрадам пролетарскага кантролю.

Барысаўскаму РК трэба абраць працаздольны склад райштабу, бо праца „ЛК" павінна быць наладжана.

Кугель.

Погляд Рабіновіча

У Падабранскім сельсавеце існуе „Лёгкая Кавалерыя" на паперы. Яна нічога ня робіць. А ня робіць яна таму, што ёю „кіруе" не комсамольская ячэйка, а... сельсавет.

АПА комсамольскай ячэйкі—тав. **Рабіновіч**—лічыць гэта зусім нормальным, бо бачыце: у атрадзе—усе комсамольцы, а таму ня вельмі патрэбна комсамольскае кіраўніцтва.

Мы лічым, што гэта зусім ненармальна. Так далей не павінна быць. Комсамол павінен кіраваць „кавалерыяй".

Сушанскі.

Ігноруюць працу груп „Лёгкай Кавалерыі"

За апошні час групы „Лёгкай Кавалерыі" у Рэчыцы, Гомельшчына, выявілі шэраг бясчынстваў па асобных організацыях, установах і прадпрыёмствах.

Раскажам аб тым, як гэтыя ўстановы і організацыі рэагуюць на выяўленыя „Легкімі Кавалерыстамі" недахопы.

„Лёгкія Кавалерысты" пры „налёце" устанавілі, што працаўнікі канторы Райсаюзу разбазарвалі дэфіцытныя тавары (галёшы, боты). Усё гэта бралася самымі апаратчыкамі бяз вучоту. Рагатае быдла знаходзіцца ў немажлівым становішчы, сена гніе. „Кавалерыстыя" напісалі аб гэтым у акруговую газэту, але заг. канторы Кірацкі, замест таго, каб адразу рэагаваць, іронічна ўсьміхнуўся.

Белмясгандаль прыняў для загатоўкі быдла па раёне загатоўцаў—былых гандляроў, нэпманаў, якія яшчэ і цяпер у даўгу ў фінвучастку. Напрыклад, Пэклер Л.—павінен 948 р. 32 к., Пэклер Х.—511 р. 85 кап., Бухман Н.—1527 р.

У акруговай газэце неаднократць пісалася ужо аб псаваньні 4000 пудоў хлеба на хлебазаводзе. Ў гэтым вінен ня толькі завод, але і праўленьне ЦРК. На заводзе сільна разьвіта шкодніцтва, бо нават і пасьля суда (а за гэтым 4000 пуд. хлеба вінаватых судзілі) хлеб сыстэматычна выпякаецца дрэнна.

Праўленьне Рачыцкага ЦРК абсталявала сьвінарнік для 500 штук сьвіней. Грошай затрацілі шмат, а ў сьвінарніку адчайны бруд. Тутжа ў двары скотабойня. Нагляду за сьвінарняй няма. Праўленьне ЦРК гэтым не займалася і займацца ня хоча. Двор бойні і сьвінарні не загароджаны. Вэтэрынарны нагляд за сьвіньнямі нікудышны.

Усе гэтыя факты былі выяўлены „Легкімі Кавалерыстымі". Яны патрабавалі рэагаваньня, але ўмовы для працы груп „Л К" ў Рэчыцы яшчэ ня створаны рэагаваньня ня было. Асобныя партячэйкі ня сур'ёзна адносяцца да „кавалерыстых". Напрыклад, група „ЛК" пытаньне аб протэкцыонізьме на заводзе „Інтэрнацыянал" паставіла на разгляд партячэйкі, але яна не палічылася з вывадамі „ЛК". На ф-цы „Днепр" рэдакцыя друкаванай газэты „Дняпровец" не зьмяшчае допісы і матар'ялы, якія здаюцца групай „ЛК" гаворачы:

— Нашто пісаць, калі група добра працуе.

Такое рэагаваньне на выяўленыя групай „ЛК" недахопы паніжае ў хлопцаў зацікаўленасьць работаю. Пры ўмовах барацьбы за прамфінплян, за рацыяналізатарскія мерапрыемствы, барацьбы з безгаспадарнасьцю, бюрократызмам, ва ўмовах разгортваньня самакрытыкі патрабуюцца самыя чулыя адносіны да „ЛК" з боку ўсёй грамадзкасьці.

М. Рэчыцкі

Больш увагі „кавалерыстым"

На зьлеце «Лёгкай Кавалерыі» Парыцкага раёну (Бабруйшчына) у канцы 1929 г. абралі раённы штаб «Л. К.» для палепшаньня кіраўніцтва працаю паасобных груп. Абралі і забыліся. Аб штабе ні духу, ні слуху. Штаб ня кіруе работай, а таму і ў атрадах няма належнай працы. Беспрацоўны штаб нам непатрэбен. Трэба выбраць новы працаздольны штаб. Комсамол павінен больш увагі ўдзеляць працы «Л. К».

Кліманок.

„Лёгкія кавалерыстыя"

9-га мая, а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена" адбудзецца першы збор атраду „ЛК" пры „Чырвонай Зьмене".

Запрашаюцца: т. т. Чарняк, Казлоў, Голубеў А., Малашэнка С. („Энэргія"), Новікаў, Барозна, Гарнашэвіч (будаўнікі), Бабоўнікаў, Шэндаровіч („Комунар"), Норкіна („Швэйпром"), а таксама жадаючыя працаваць ў атрадзе „ЛК" пры газэце.

Рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена".

Распушчана бюро колектыву КСМ Гомбелпэдтэхнікуму

У Гомельскім Белпэдтэхнікуме да гэтага часу выхоўвалася шмат соцыяльна і ідэолёгічна чужых нам людзей: дзеці папоў, кулакоў, нэпманаў і г. д., аб чым ужо друк сыгналізаваў. Пад уплыў нацдэмократаў і чужых нам студэнтаў падпалі і некаторыя комсамольцы.

У некатарай частцы комсамольцаў пануе аполітычнасьць. Комсамолка Башкіна, праводзячы на заводзе „Рухавік Рэволюцыі" гутарку аб правым ухіле імкнулася давесьці, што гэта лінія партыі. У тэхнікуме наглядаюцца праявы шовінізмаў розных колераў. Калі профком вынес вымову т. Сімаковіч за праяўленьне вялікадзяржаўнага расійскага шовінізму, комсомолка Малкіна, старалася яе абараніць.

Невыпадкова і тое, што стары член бюро колектыву—Якубоўскі,—гуляючы з таварышамі, кідае лёзунгі: „Бей жыдоў, спасай Расію" і як член парткому на пасяджэньні абараняе антысэмітаў. За пяць месяцаў з комсамолу выключана 4 чалавекі.

Трэба зазначыць, што бюро камсамольскага колектыву і курсавых ячэек несвоечасова рэагавала на гэтыя зьявішчы. З боку былога сакратара колектыву Абушанькі нагляdaліся факты зацiску самакрытыкі.

Падводзячы вынікі чысткі Гомельскага Белпэдтэхнікуму, бюро РК КСМ ухваліла: распусьціць бюро колектыву і курсавых ячэек. Я лічу, што гэтым абмежавацца ні ў якім разе нельга, бо ў хуткім часе будзе выпускацца 4-ты курс і да выпуску абавязкова патрэбна комсамольская чыстка курсаў. Трэба праверыць у сапраўднасьці ці зможа той ці іншы комсамолец выканаць задачы, ускладзеныя на яго партыяй і комсамолам.

Ярмак Кастусь.



На вышыні становішча

Шмат якія групы „Лёг[кай] кавалерыі" працуюць бяз [п]лаў, нядбайна адносяцца да [зада]ньняў і г. д.



Ці не пара заняцца справай і опусціцца на зямлю?

На пяро „лёгкага кавалерыста"

У Гіжанскім лясьніцтве, Прапой[ска]га раёну, працуе Жураўкоў Абрам [з] Любань, Целяшоўскага сельсавету, [у] якасьці рахункавода. У 1929 годзе, [ка]лі адбылася чыстка савапарату [Пра]пойскага раёну, ён быў выключан [з] партыі і зьнят з працы старшыні с[ель]савету за скажэньні клясавай лініі.

Але цяпер ён пралез у Гіжанс[кае] лясьніцтва і там працуе, з мэтай [вы]лезьці ў шэрагі партыі.

Ці ня лепш было-б шкодніка [з] апарату зьняць зусім з працы.

Янічка Кулоў

* * *

У мсьціслаўскім Пэдтэхнікуме [ву]чыцца студэнт Янка Каўрыжка, [які] лічыцца сынам рабочага і атрымл[івае] стыпэндыю. Ён—член комсамолу. [На] самай справе бацька яго, які жыв[е] ... м. Копысь, выключан з заводу за [тое], што быў сябром чорнасоценнай ор[га]нізацыі „Іосьціння рускіх людзей". ... антысэмітызм, за правы ўхіл ... Янку Каўрыжку суровую вымо[ву]. Мы лічым, што Каўрыжку трэба [вы]ключыць з комсамолу і тэхнікуму.

Юнкора-Кавалерысты

* * *

Ужо некалькі раз пісалася аб х[і]... Кастрычнікаўскага сельскага спа[жы]вецкага таварыства, а яно і ўвагі [не] зьвяртае на гэта. Дэфіцытныя тава[ры] адпускаюцца больш заможным, а ... трэбнасьць бедняты ня ўлічваец[ца]. Тавары разьмяркоўваюцца не пр[аў]леньнем, а самім старшынёю пр[аў]леньня тав. Гольштэйнам, які да гэтага раней тавары завозіць дам[ой] —к сабе, а праўленьне аб гэтым [не] ведае.

Сходы пайнікаў ніколі ня зьбіра[юц]ца, а недарэчнасьцяй маецца шм[ат] растраты і інш. „справы", аб як[іх] пайнікі ня ведаюць.

Партячэйка—тут-жа, пад бокам, нічога не прадпрымае. Патрэбна зьв[яр]нуць каму-небудзь увагу.

Пайнік

* * *

Якім чынам Б. Жуку ўдалося за... пачыць пэдагагічныя курсы, нам [не]вядома, але зараз ён ужо іх скон[чыў] і працуе пэдагогам у вёсцы ў ... вёрстах ад Бегамольля.

Кто ён, гэты самы настаўнік-вы[хоў]вальнік будучага пакаленьня. Бац[ька] яго служыў жандармам, а пры сав[ец]кай уладзе яму ўдалося папасьці [у] міліцыю ў якасьці міліцыянэра. [У] гэтай пасадзе ён праводзіў контр-р[э]волюцыйную работу і займаўся б[ан]дытызмам, за што быў растрэлян.

Яго брату М. Жуку, таксама ўда[ло]ся папасьці на працу настаўніка, ... ён, баючыся раскрыцьця яго тва[ру], выехаў у Новарасійск і там выхоў[вае] дзяцей.

Мы лічым, што В. Жук, як і ... брат М. Жук ня могуць ні ў як[ім] выпадку быць настаўнікамі ў сав[ец]кай школе.

Зўрын

* * *

У гор. Мазыры адчыніліся мэліор[а]цыйныя курсы, на якія райкомы ком[]самолу далі сваіх лепшых комсамо[ль]цаў. Нараўлянскі РК КСМ прыслаў ... асобы. З гэтых трох асоб ёсьць ад[зін] Носка Павал, бацька якога індыві[ду]альна абкладзены з-за таго, што [гас]падарка вельмі заможная. РК ня пр[ы]няў гэтага пад увагу.

Ударнік.

Выязная рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена" у Віцебску

„... АГІТУЕМ І БУДЗЕМ АГІТАВАЦЬ..."

У ГЭТЫМ ЗАКЛЮЧАЕЦЦА ПРАЦА НЕКАТОРЫХ КІРАЎНІКОЎ ЗАВОДАЎ. ТЭХНІЧНЫЯ ВЕДЫ ЯШЧЭ НЕ ПРАСУНУТЫ Ў МАСЫ. НА ЛІЦЕЙНЫМ ЗАВОДЗЕ „ЧЫРВОНЫ МЭТАЛІСТЫ" ПА СТАРОМУ ПАНУЕ БЕЗГАСПАДАРНАСЬЦЬ. КАРЭННАГА ПЕРАЛОМУ ЯШЧЭ НЯМА

Без карэннага пералому ў працы заводу—прамфінплян пад пагрозай зрыву

Пустым размовам, рэзолюцыям, безадказнасьці павінен быць паложан канец

У ліцейнай--без перамен

Ліцейны цэх—гэта вялікае сэрца заводу. Ад яго бесьперабойнай правільнай работы залежыць пасьпяховая работа астатніх цэхаў. Калі-б здарылася што-небудзь у ліцейным, дык гэта адбілася-б і на рабоце ўсяго заводу.

У гэтым артыкуле мы хочам паказаць сапраўдны твар ліцейнага цэху заводу „Чырвоны Мэталісты", яго прыстасаванасьць да працы і змаганьне за выкананьне прамфінпляну і зьнішчэньне браку.

За апошні час брак у цэху пачаў значна павялічвацца. Так, калі ў лютым месяцы мы мелі браку 9 проц., дык за сакавік мы маем 7,4 проц., а за першыя 15 дзён красавіка брак дасягнуў пагражаючых разьмераў—11 проц.

Адлітыя нядаўна крытыя шасьцяронкі для конных прывадоў у колькасьці 243 шт. ня сходзяцца ў дыяметры на 6 мм. Толькі за два дні было забракавана 135 веялачных падшыпнікаў.

З 27-га лютага па 21 сакавіка ліцейны цэх даў браку: 104 цыліндрычных шасьцяронак, 80 падвойных шасьцяронак. Мэханічны цэх пры абточцы таксама забракаваў 29 шасьцяронак, як дрэнна адлітыя. Увесь гэты брак даў заводу страты на 455 руб.

Паўстаюць пытаньні:—хто зьяўляецца конкрэтным носьбітам гэтага зла, дзе карэньні прычын павялічэньня браку і чаму на барацьбу з ім ня былі своечасова мобілізаваны ўсе сілы заводу?

Галоўная прычына дрэннай якасьці выпускаемай з ліцейнага цэху прадукцыі—гэта халатныя адносіны с міх рабочых да сваіх абавязкаў.

Ва многіх выпадках кваліфікаваныя рабочыя даюць большую колькасьць браку, чымся нізка кваліфікаваныя. Паасобныя спэцыфармоўшчыкі працуюць з халадком і не выпускаюць тае нормы, якую выпускаюць рабочыя з ніжэйшымі разрадамі толькі таму, што яны спэцы атрымліваюць за сваю работу не ад выпрацоўкі, а па сярэдняму. К прыкладу, можна прывесьці такі факт: Нізка кваліфікаваны рабочы фармуе ў дзень да 8 крытыя шасьцяронкі, а кваліфікаваныя такую-ж работу правоўзяць удваіх.

Здавалася-б, што выпускаючы меншую норму кваліфікаваныя фармоўшчыкі павінны былі даць добрую якасьць, але, на вялікі жаль, гэтага няма.

Усе магчымасьці правільнай арганізацыі працы не выкарыстоўваюцца, глыбокага вывучэньня прычын браку не вядзецца, рабочыя ў гэтым ня ўдзельнічаюць. Тройка па барацьбе з бракам амаль што ніякай работы не праводзіць. Брак, які зьмяшчаецца ў вітрынах, ня мае ніякіх тлумачэньняў і рабочыя ня ведаюць прычын яго зьяўленьня.

У значнай меры брак залежыць ад зямлі, з якой фармуюцца дэталі. На працягу цэлага году ад штодзённай адліўкі зямля перагарэла і згубіла прыгоднасьць да фармоўкі.

Шышальнае аддзяленьне забясьпечвае фармоўшчыкаў дрэннымі шышкамі, у якіх няма паветра, ад чаго выходзіць брак.

Пры заліўцы форм расплаўленым чыгуном, часьцяком адны формы пераліваюцца, а другія недаліваюцца. Гэта таксама вядзе да павялічэньня браку. Вагранка дае ў гадзіну 340 пудоў расплаўленага чыгуна і сем разьлівальшчыкаў не пасьпяваюць правільна і акуратна заліваць формы.

Наглядаюцца выпадкі няправільнага рамонту мадэляй з-за чаго дэталі выходзяць няправільнымі, адсюль і брак. Недахоп інструманту, дрэннае абслугоўваньне пляцу падсобнай рабочай сілай—ўсё гэта адбіваецца на правільнай рабоце цэху і на якасьці выпускаемай прадукцыі.

Неабходна пасьля кожнай адліўкі заняцца вывучэньнем браку, прыцягнуць да гэтай справы інжынэрна-тэхнічны пэрсанал, які на сёньняшні дзень амаль што ня ўцягнут у гэтую работу, а яго ўдзел неабходны, яго чакаюць рабочыя. Прыняць рашучыя захады да ліквідацыі тых дробных недахопаў, якія адбіваюцца ў значнай меры на выкананьні прамфінпляну і затрымліваюць ліквідацыю браку.

Прыступіць да ажыцьцяўленьня прапаноў, якія ўнесены рабочымі на вытворчых нарадах.

Чарговая задача рабочых ліцейнага цэху—выжыць чарапашыя тэмпы ў сваёй рабоце і вызваліць цэх ад таго становішча, у якім ён зараз апынуўся.

Х. Б. В. С.

Першая ўдарная

Прыблізна ў першых лічбах мая 1929 году ў зборна-веялачным аддзяленьні была організована першая ў дрэвапрацовачным цэху ўдарная брыгада, якая складалася з 11 чалавек і выпускала 40—50 веялак ў дзень.

Зараз, калі ў брыгадзе засталося толькі 8 чалавек, яна выпушчае па 75—90 веялак.

Па дагавору брыгада павінна была выпушчаць 70 веялак, а яна правышае сваё заданьне на 15—20 веялак. Сабекошт зьніжан на 10 проц.

Брыгада цалкам уступіла ў партыю. Сярод уступіўшых ёсьць рабочыя з 30-гадовым рабочым стажам.

Адміністрацыя і профорганізацыі не **дапамагаюць** брыгадзе, *а нават* **зрываюць яе работу**: *брыгада несвоечасова забясьпечваецца паўфабрыкатам, што адбіваецца на яе рабоце. Часта бываюць перабоі ў рабоце з-за дрэлі, якой карыстацца* **2 цэхі.** *19 красавіка брыгада, замест 70 веялак, выпусьціла ўсяго 40, з прычыны таго, што працавалі непрыстасаванай дрэльлю. У гэты дзень на сьвярлоўцы замест 2 чалавек, працавала 4. Тэхнічны пэрсанал, хоць і узяў шэфства над брыгадай,* **але зусім ёй не дапамагае.**

Б. РЫЖЫНСКІ.



Ударная брыгада па зборцы веялак на заводзе „Чырвоны Мэталісты"

Словы... Словы... Словы...

Дырэктывы апошняга пленуму ЦК УсеЛКСМ аб разгортваньні тэхнічнай адукацыі сярод ударнікаў і комсамольцаў на „Чырвоным Мэталістым" не атрымалі належнага ажыцьцяўленьня. Кіраўнікі колектыву не ацанілі гэтай дырэктывы і ня ўпямілі яе каштоўнасьць, асабліва зараз,—у пэрыод рашучай барацьбы за выкананьне прамфінпляну.

Каб апраўдаць дапушчаныя ў гэтым напрамку ляпсусы, кіраўнікі колектыву казыраюць непадыходзячай да іх прыказкай: **„Нічога,—калі небудзь запрацуем. Лепей позна, чым ніколі".**

„...Што-ж, агітуем і будзем агітаваць..."

Пры заводзе існуюць прафтэхкурсы, якія з 800 рабочых наведвае ўсяго 10-15 чалавек і 2 камсамольцы (гэта з 75 чалавек!). Комсамольская організацыя заводу і сэкцыя ІТС нічога не зрабілі, каб папулярызаваць гэтыя курсы ў масах рабочых і рабочай моладзі. На запытаньне:—што конкрэтна зроблена сэкцыяй ІТС для палепшаньня работы курсаў. Член ІТС, т. Караўкін, адказаў: „Што-ж агітуем і будзем агітаваць". Адной з прычын правалу работы курсаў зьяўляецца недагаворанасьць і адсутнасьць усякага ўзгадненьня дзён вучобы, сходаў і розных пасяджэньняў. На ўсё хапае часу, **а для работы профтэхкурсаў яго не знаходзіцца.** Комсамольскі колектыў і профарганізацыі заводу на тэхадукацыю глядзяць як на нешта непатрэбнае. Бронь-вучні таксама працуюць бяз ўсякага тэхнічнага нагляду. Інструктар падыходзіць да іх надта рэдка.

Работы няма, за тое абяцаньняў хоць адбаўляй

Сэкцыя ІТС зусім не дапамагае ўдарным брыгадам. Абвешчанае над ударнымі брыгадамі шэфства інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў існуе толькі на паперы. Прымацаваныя да цэхаў тэхнікі нічога ня робяць. У сваім сацдагаворы інжынэрна-тэхнічныя працаўнікі сярод іншых пунктаў уставілі пункт аб ліквідацыі тэхнічнай няпісьменнасьці сярод рабочых. На жаль, ён застаўся толькі на паперы. Многія інжынэрна-тэхнічныя працаўнікі непрасоўваньне тэхнічных ведаў у масы рабочых тлумачаць перагружанасьцю рабочых грамадзкай работай (!?).

Гэта замест настойлівай работы ў гэтым напрамку.

Загадчык памянёных прафтэхсаў—т. **Цырлін**—увесь час ляпеча аб нейкай „прыманцы", якая нібы існуе на іншых курсах (!?). Пад гэтай прыманкай ён мае на ўвазе аслабаненьне курсантаў на гадзіну раней ад работы і г. д. **Праца з вынаходцамі на заводзе зусім заглохла.**

Колектыў комсамолу пытаньнем тэхвучобы не займаўся

За апошні час у цэхах: мэханічным, ліцейным і па зборцы малацілак брак **значна павялічыўся.** Павялічэньне браку часта мае месца па віне тэхнічнай няпісьменнасьці рабочых. Але, тут з гэтым лічыцца ня хочуць. Рабочым выносяць вымовы, здымаюць з работы, а каб вывучыць прычыны браку, вызначыць крокі да яго зьнішчэньня—**гэтага няма.** Асабліва гэта датычыцца ліцейнага цэху.

Ні комсамол, ні ІТС, ні профорганізацыя заводу амаль нічога не зрабілі ў напрамку вывучэньня прычын браку. Комсамольцы і рабочая моладзь заводу **не наведвае курсаў**, ды і самі цэхавыя ячэйкі **ніколі ня ставілі** пытаньня аб прасоўваньні тэхнічных ведаў, а некаторыя з іх нават і ня чулі аб такой дырэктыве партыі і комсамолу.

Трэба безадкладна дабіцца належнага пералому. Комсамольскаму колектыву трэба стаць застрэльшчыкам у мобілізацыі мас на ліквідацыю тэхнічнай няпісьменнасьці сярод комсамольцаў, рабочай моладзі і сярод рабочых ўсяго заводу. Сумесная работа комсамолу, ІТС і профсаюзаў зможа зьнішчыць гэты прабел.

Віт. Сідарук.

Профтэхведаў захацеў? Абыйдзешся бяз іх!

З большай упартасьцю, да далейшай барацьбы

Ліквідуем прарывы да XVI партзьезду

Усім пролетарам Савецкага Саюву!

Сёньня пролетарыят і працоўныя сяляне савецкай Украіны адзначаюць вялікую гістарычную веху на шляху пераможнага паходу да соцыялізму. 29 красавіка 1929 году 16 усесаюзная конфэрэнцыя УсеКП(б) зьвярнулася да ўсіх рабочых Савецкага Саюзу з заклікам організаваць „спаборніцтва заводаў, фабрык, капальняў, чыгунак, саўгасаў, колгасаў, савецкіх установ, школ і бальніц".

Ідэя Леніна аб соцыялістычным спаборніцтве стала „плоцьцю і крывёю" нашай сапраўднасьці, яна прывяла ў баявое дзеяньне нявычэрпныя крыніцы пролетарскага энтузіязму і ініцыятывы.

Мінулы год быў годам шпаркага наступленьня пролетарыяту пад сьцягам спаборніцтва ў барацьбе за пяцігодку, годам падцягваньня шматмільённых батальёнаў бядняцка-серадняцкага сялянства да непасрэднага вырашэньня задач соцыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

Іменна на аснове соцыялістычнага спаборніцтва ў нетрах ударнага руху паднялася і ажыцьцяўляецца **ідэя выкананьня пяцігодкі ў 4 гады.** Мы зьдзіўляем увесь сьвет гіганцкім размахам будаўніцтва. **Турксіб, сталінградзкі трактарбуд, Днепрабуд—гордасьць савецкай Украіны,—раней намечанага тэрміну ўступаюць у работу ў выніку соцыялістычнага спаборніцтва.**

Сёньня, у дзень гадавіны соцыялістычнага спаборніцтва, Усесаюзны Цэнтральны Савет Профэсыянальных Саюзаў і ЦК УсеЛКСМ шлюць палкае прывітаньне ўсім пролетарам, усім ударнікам—удзельнікам соцыялістычнага спаборніцтва, якія вядуць гэроічную барацьбу за выкананьне гаспадарчых плянаў.

У дзень гадавіны соцыялістычнага спаборніцтва, УсеЦСПС горача вітае ініцыятараў соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарнага руху—ленінскі комсамол, ініцыятараў і кавалеў бальшавіцкіх тэмпаў—пролетараў Златаўстаўскага мэханічнага заводу, „Чырвонага Выбаржца", рабочых Каменкі і данецкіх шахцёраў—першымі падняўшых сьцяг спаборніцтва.

Сёньнешняя гадавіна—гэта ня сьвята ў звычайным сэнсе. Адна з лепшых традыцый бальшавікоў і ўсей рабочае клясы—**не зазнавацца, бязьлітасна змагацца з «галавакружэньнем ад посьпехаў», Яшчэ цэлы шэраг галін вытворчасьці і прадпрыемстваў ганебна адстаюць у выкананьні прамфінпляну.**

Рашаючая задача — дабіцца, як бы там ні было, хутчэйшай ліквідацыі прарываў, выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну.

Па ўсёй нашай неабдымнай краіне ідзе зараз самаправерка соцыялістычнага спаборніцтва. УсеЦСПС і ЦК УсеЛКСМ клічуць мільёны пролетараў: актыўна ўдзельнічайце ў самаправерцы, сьмела і бязьлітасна ўскрывайце ўсё, што перашкаджае выкананьню прамфінпляну. Згуртуйце свае шэрагі. Больш вірнасьці і дбайнасьці! Адмятайце лжэ-ударніцтва, зрывайце маску з лжэ-ударнікаў. **Самаправерка павінна падняць спаборніцтва на вышэйшую ступень і ўтварыць пералом у выкананьні прамфінпляну.**

Праз месяц УсеЦСПС падвядзе вынікі самаправерцы. Рабочая кляса Савецкага Саюзу павінна **ведаць імёны сваіх лепшых ударнікаў, лепшых ударных брыгад, лепшых ударных прадпрыемстваў.** Няхай па іх раўняюцца ўсе пролетары, няхай аб іх даведаецца ўся наша краіна.

Дні 1-га мая, якія супадаюць з гадавінай соцспаборніцтва павінны ператварыцца ў магутную дэманстрацыю дасягненьняў соцыялістычнага будаўніцтва і спаборніцтва, павінны быць днямі баявой мобілізацыі сіл на далейшую барацьбу і перамогі.

У дзень гадавіны соцспаборніцтва УсеЦСПС і ЦК УсеЛКСМ заклікаюць пролетараў Савецкага Саюзу мобілізаваць усе сілы на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Дабівайцеся ліквідацыі прарыву на сваіх прадпрыемствах да 16 зьезду партыі.

УсеЦСПС, ЦК Усе ЛКСМ

Да адказнасьці заціскачоў самакрытыкі

Патрабуем тэрміновых захадаў да высьвятленьня справы аб траўлі юнкора „Міхася“

На Капцэвіцкі завод „Зьвязда“, Мазырскай акругі, прышоў малады батрак. У вочы кінулася безгаспадарнасьць, якая панавала на заводзе. Ён ставіць сваёй мэтай весьці з усім гэтым барацьбу і першым яго крокам быў допіс у газэту „Чырвоная Зьмена“ падпісаны псэўдонімам „Міхась“. У гэтым допісе Міхась піша аб ходзе па чыстцы савапарату, аб тым, што пры чыстцы выявіўся заціск самакрытыкі і што ў праверцы дырэктара заводу рабочыя ня прымалі ніякага ўдзелу, тады, як за вуглом шмат аб ім гавораць і крытыкуюць яго працу. Пасьля гэтага сходу, на якім сэкратар комсамольскай ячэйкі хваліў дырэктара, Міхась застаў іх разам на станцыі за бутэлькаю піва, а потым... а потым пачынаецца доўгая істужка цесна ўвязанага цкаваньня. У сваіх допісах Міхась рашуча ставіць пытаньне аб усіх выпадках заціску самакрытыкі і безгаспадарнасьці.

Праз некаторы час рэдакцыя атрымала ліст, не падобны на звычайны допіс. Вось ён:

„Шаноўны таварыш рэдактар і астатнія таварышы з рэдакцыі! На гэты раз дасылаю вам ня простую корэспондэнцыю, допіс у вашу газэту, а кавалачак свайго жыцьця“...

А далей ідзе апісаньне гэтага кавалачка маладога жыцьця, адданага на барацьбу за лепшае, за наша будаўніцтва. Міхась піша:

„... Калі я прыехаў на завод „Зьвязда“, я адразу ўбачыў тут шмат чаго недарэчнага і задаўся, як заўсёды, зьнішчаць апошняе...“

Але ня лёгка змагацца і зьнішчаць недахопы, калі галавацяпы ўпарта трымаюцца за старое, з усёй рашучасьцю змагаюцца з перадавікамі-рабкорамі і вось...

„... На другі дзень пасьля зьяўленьня на сьвет допісу: „Да адказнасьці“, на сходзе колектыву ў часе спрэчак, дзе закранаті гэты допіс, паказалі на мяне. Кліча мяне на сцэну сэкратар колектыву і пытае:—ты пісаў у газэту?—Я адказваю:—якая розьніца, я ці не, абы адпавядаў сапраўднасьці“. На гэтым разе было зацьверджана, што пісаў я. Дагадаліся мабыць таму, што я актыўна сябе вёў у час чысткі. Псэўдонім быў выкрыты. Даведаліся, што пісаў я і другія допісы...“

Так комсамольскі колектыў праводзіў у жыцьцё лёзунг самакрытыкі, так заводзкія кіраўнікі змагаліся за актыўны ўдзел працоўных у чыстцы савапарату, так галавацяпы навучыліся ў выглядзе актыўнага рабочага шукаць рабкора і змагацца з яго дзейнасьцю. І так, волею сэкратара колектыву псэўдонім юнкора быў выкрыт. Усе ўжо ведаюць, хто такі „Міхась“. А тады:

„... за мной пачалі сачыць. Кожны крок мой быў абмеркаваны. Майстар Брэгман, пасьля двух разоў, калі я аб ім пісаў у газэту, ганяў мяне па заводу, не даваў работы, а калі і дасьць, дык самую горшую...“

Але і гэтага стала мала. Бюракраты пачулі, што толькі гэтым справу барацьбы з самакрытыкай не правядзеш і тады пачынаецца новы мэтад дзеяньня, новыя сродкі пускаюцца ў ход. Галавацяпы памятаюць дэвіз: „мэта апраўдвае сродкі“ і яны ў пагоні за сваёй мэтай ідуць на ўсё, ня лічацца ні з чым. Новыя сродкі барацьбы з рабкорам—больш удасканаленыя, тонкія пускаюцца ў ход.

„... Ужо гаворачы цяпер аба мне, кожны гаварыў як аб рабкоры...“

Аб ім ужо гавораць не як аб рабочым, а як аб рабкоры. У яго асобе бачаць ня звычайнага актыўнага рабочага, а нешта іншае. Самы маленькі яго асабісты недахоп, самая маленькая памылка яго, як нядаўна прышоўшага з вёскі рабочага скарыстоўваецца для компромэнтацыі яго, як рабкора. І вось:

„...калі быў сход рабочых—піша Міхась—з справаздачай вытворчай камісіі аб соцспаборніцтве і ўдарных брыгадах я патрабую запісаць у пастанове аб бюрократычных адносінах завкому да ўдарных брыгад, але, каб замазаць гэты факт, адміністрацыя абрушылася на мяне за тое, што я асабіста запісаўся ў брыгаду ня з першымі“...

Так галавацяпы дабіваюцца дыскрэдытацыі аўторытэту рабкора і друку.

„...З таго сходу ўсе штодзённа на мяне насядаюць. Дзе я ня так павярнуся, ня так сказаў, дзе зрабіў памылку, аб гэтым у розных формах з рознымі грымасамі мяне асаджваюць“.

...На гэтым азьвярэлыя бюрократы не застанаўліваюцца.

Варта было зьявіцца ў газэце допісу „Пад шыльдай ударнага“, як яшчэ з большай энэргіяй дырэктар заводу пачаў на мяне насядаць, а калі прачыталі допіс—„Рэзолюцый гара, спраў пустое месца“, дзе ў кароткіх рысах я характарызаваў працу на заводзе, дык утварылася вось што: ужо цярпеньне ўсіх кіраўнікоў лопаецца...“

І тады пачынаецца канчатковы бой. Міхася абвінавачваюць у зьняважаньні рабочага колектыву тым, што ён піша, што завод „Зьвязда“—кандыдат на чорную дошку. Яго называюць ілжэ-рабкорам, ставяць пытаньне аб зьняцьці яго з працы і даводзяць яго да таго, што:

„... Далей не магу. Пішу Вам у рэдакцыю. Прышоў з трэцяй зьмены, ня сьпючы ноч. Я сяджу, ледзь саджу да 12 гадзін дню і пішу. Ужо два разы я браўся за пяро і кідаў, думаючы, што пратрэцца, але такія ўтвораны абставіны, што далей ужо некуды...“

Хопіць!

Галавацяпы, якія змагаюцца з самакрытыкай, пускаюць у ход усе сродкі для барацьбы з ёю, яны імкнуцца на асобных дробных памылках рабкора, як рабочага, ганьбіць і цкаваць яго як рабкора.

Хай-жа бюрократы ўсіх масьцей, і асабліва з заводу „Зьвязда“, ведаюць, што наша пролетарская грамадзкасьць ня дасьць зьдзекавацца над юнкорам.

Чакаем рашучага слова прокуратуры і належных партыйных органаў.

Л. Глезер.

Ад рэдакцыі: Зьмяшчаючы артыкул, пабудаваны на аснове дасланага ліста аб цкаваньні юнкора „Міхася“, рэдакцыя зьвяртае на гэта ўвагу належных партыйных органаў і прокуратуры і чакае безадкладнага высьвятленьня гэтай справы з дасылкай належных матар'ялаў у рэдакцыю.

Самакрытыка па-капцэвіцку



— Міласьці просім—крытыкуйце!

Роза вяне ад марозу



Гэта-ж Роза ніколі...
Ну дык вырвем яе з карэньнем!

Не падрыхтоўваюць

Аб падрыхтоўцы лепшых маладых рабочых у ВНУ і ВТНУ на заводзе „Зорка“ (Капцэвічы) ведаюць, шмат гавораць, але нічога ня робяць.

Няма ніякіх курсаў для падрыхтоўкі і ніхто не падумае аб іх організацыі. Праўда, маецца школа рабочай моладзі ўзвышанага тыпу, але ў напрамку падрыхтоўкі лепшай часткі рабочых у гэтай навучальнай установе, аб кадрах для соцыялістычнай прамысловасьці ніхто, нічога ня робіць. Патрэбна, як мага хутчэй гэтае пытаньне вырашыць і зрабіць усё неабходнае.

Юнкор Міхась.

Файвішаў не здаволен

Існуюць у нас у загатоўчым аддзяленьні менскай абутковай фабрыкі 4 комуны, якімі ахоплена 20 чалавек. Комунары сумленна адносяцца да сваёй працы і зьяўляюцца сапраўднымі перадавікамі на вытворчасьці. Але майстру **Файвішаву** *гэта не спадабалася. На днях меў месца такі выпадак: адна комуна ладаўшчыкоў стаяла бяз працы. Калі комунары падышлі да майстра* **Файвішава** *і патрабавалі або працы, або каб ён падпісаў фармальны прастой, ён адказаў: „Трэба паставіць пытаньне аб разгоне такіх комун“.*

Недахопам у працы гэтых комун трэба лічыць малую колькасьць уцягнутай моладзі, бо моладзь яшчэ не навучылася сьвядома адносіцца да працы, ня прывыкла яшчэ да такіх умоў, якія складаюцца на нашай новай фабрыцы пры мэханізацыі ўсіх працэсаў работы. Кацнэльсон.

„Зжаліліся“ над сваім таварышом!

Комсамольская група 5-га курсу Мэдфаку, у сваім асноўным складзе,—здаровая. Але, разам з гэтым, ёсьць і адмоўныя бакі. Палітузровень некаторых комсамольцаў нізкі. Некаторыя студэнты зусім адарваны ад вытворчасьці.

Цяпер пяройдзем да вынікаў чысткі. Студэнт-комсамолец Агейчанка за скрыцьцё маемаснага стану бацькоў і самавольную выпраўку ў сваёй анкеце атрымаў суровую вымову. Таксама комсамолка Рэйнблат пры паступленьні ў комсамол захавала, што яе бацькі займаліся гандлярствам. Рэйнблат выступіла ў абарону аднэй комсамолкі—прымірэнкі да лішэнцаў. За ўсё гэта праўяркам рашыў выключыць яе з комсамолу. Асноўная маса комсамольцаў і сьвядомая частка беспартыйнага студэнцтва адобрыла рашэньне камісіі, але, на вялікі жаль, знашліся і такія, якія „зжаліліся“ над сваім таварышом. Напрыклад, комсамолка Лобач, гаворыць: „добры таварыш“, „добрая дзяўчына“.

СТУДЭНТ.



За здаровы адпачынак

Безгаспадарнасьць... закаранеласьць... вал

Пабудова стадыёну. Годны лесаматар'ял раскіданы на ўсёй
дове. Кладоўкі няма, мяшкі з вохрай мокнуць, фарба залівае
джом. На двары пад адкрытым небам ляжаць бочкі з оленаф
догляду і расьцягваюцца. Адміністрацыя мяркуе з'эканоміць і н
кладоўкі, але тое, што 40 бочак цэманту скарыстаны не па
насьці і што іх магчыма было замяніць вапнаю,—гэта адміні
мала цікавіць. Усё гэта адбываецца ў той час, калі на пабудо
і тэхнік і дзесятнік, што таксама зьяўляецца недапушчальнай
шай пры недахопе тэхнічных сіл.

...Нават не абгаварылі

Ячэйка ЛКСМБ 1-ай скур. арцелі (Магілеў) яшчэ нават не абгаварвала пытаньня гадавіны соцыялістычнага спаборніцтва, з якім комсамольцы і рабочая моладзь зусім не знаёмы. Чым-жа ячэйка тлумачыць такое становішча? Сэкратар ячэйкі, тав. АШКІНАДЗЕ, КАЖА:

— Мы да гэтай работы не прыступілі таму, што ў арцелі не хапала работы і сыравіны. Ну,—дапусьцім, што гэта так.

Але-ж чаму зараз нічога ня робіцца, калі работы і сыравіны выстарчае? Чаму зараз ячэйка першай скур. арцелі сядзіць у мора і чакае надвор'я? На гэтыя пытаньні адказ просты:

Комсамольская ячэйка, у прыватнасьці бюро, замест мобілізацыі комсамольцаў і беспа
моладзі на сваечасовае
выкананьне прамфінпля
значна недавыкананы, зам
веркі ўдзелу комсамолу і
ў гаспадарча - вытворчай
нічога не зрабіла, а пла
хвасьце.

Комсамольцы і беспарты
бочая моладзь на выт
зусім слаба абслугоўваю
кай, у сувязі з чым
ячэйка ня ведае чым дыха
комсамолец і малады рабо

З такім багажом прышла
комсамолу першай скур. а
гадавіны соцыялістычнага
ніцтва. Лёганькі багажэц!
абходна павялічыць.

Б. ЛІЎ

Суботнік дапамог калгасу

Лельчыцкая комсамольская ячэйка (Мазыршчына) увесь ча
мала актыўны ўдзел у разгортваньні колектывізацыі ў сельс
зараз пераключыла працу на практычную дапамогу колгасам
вядзеньні вясеньняга севу.

У колгасе „Чырвоны Араты“ не хапала працоўнай сілы дл
біўкі ўгнаеньня, дык комсамольская ячэйка, організаваўшы субо
вучнямі школы сямігодкі, дапамагла разьбіць угнаеньне і, апра
тага, пратруціць 80 пудоў аўса.

Стасе

Адкрыўся летні спартыўны сэзон

1-га мая адкрыўся летні спартыўны сэзон. На спортпляцоўцы саду „Прафінтэрн“ і на стадыёне МББ чыг. адбыліся спаборніцтвы па гульнях, лёгкай атлетыцы і інш.

Пры вялізарным натоўпе рабочых сэзон адкрыўся футбольным матчам паміж „Дынама“ і мэталістымі. Матч скончыўся з разьлікам—4 : 0 у карысьць „Дынама“.

Футбольны матч „Дынама“
дывізіён скончыўся перамог
нама“ — 12:0.

Валейбольны матч
фізкультуры — дрэваапра
скончыўся перамогай тэхні
2 : 1.

Саюз дрэваапрацоўшчы
крыў водную станцыю. Бы
шчана 17 розных лодак і
лыжы.

Адказны рэдактар—Рэдколе

10-га мая, а 6-й гадзіне ўвечары, у памяшка
Нова-Барысаўскага рабочага клюбу (быўшы ЛЮКС)
будзецца агульна-гарадзкая конфэрэнцыя юнкораў і
тачоў комсамольскіх газэт разам з упаўнаважанымі
падпісцы.

Парадак дня: 1. Становішча комсамольскага др
і далейшыя яго задачы (дакладчык-прадстаўнік „Чыр
най Зьмены“—тав. Самуцін).

2. Становішча падпіскі па Барысаўскім раёне.

БАРЫСАЎСКІ РК ЛКСМБ

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599